**УДК 37.01(476)”9/16”**

# ФІЛАСОФСКІЯ АСПЕКТЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫІ СТАРАЖЫТНАЙ БЕЛАРУСІ X–XVIII стст.*

***канд. філас. н. Д.А. СМАЛЯКОЎ***
***(Інстытут філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Минск /***
***Лінганьскі педагагічны ўніверсітэт)***

*Разглядаюцца філасофскія аспекты інтэрнацыяналізацыі адукацыйных працэсаў старажытнай Беларусі ў часовым прамежку паміж X–XVIII стст. Пачынаючы з этапу фармавання Старажытнай Русі і завяршаючы перыядам росквіту Іезуіцкіх калегіумаў інтэрнацыяналізацыя адукацыі з’яўлялася адным з асноўных элементаў як генезісу, так і падрымання адукацыі старажытнай Беларусі. Гэтыя ж працэсы разглядаюцца як змена ўплыву Візантыйскай філасофіі на схаластычную філасофію заходняй Еўропы. У якасці вынікаў падкрэсліваецца роля адукацыі ў станаўленні хрысціянскай іерархіі і рэлігійнай дзейнасці ў старажытнай Беларусі, а таксама індывідуальнай альтэрнатывы да кар’ерных перспектыў у вайсковай сферы.*

***Ключавыя словы:*** *інтэрнацыяналізацыя адукацыі Беларусі, візантыйская філасофія, схаластыка, гісторыя беларускай адукацыі.*

Гісторыя беларускай адукацыі з’яўляецца даволі распрацаваным і запатрабаваным аб’ектам навуковых даследаванняў. Кароткі агляд генезісу вышэйшай адукацыі на Беларусі зрабілі у сваім артыкуле Я. Яноўскі і А.Ф. Самусік “Універсітэт Беларусі: асэнсаванне і рэалізацыя яго ідэі ў гісторыка-палітычных рэаліях часу” [1]. Адукацыйным рэформам прысвечаны артыкул Я.В. Тарасюка “Рэформа адукацыі ў Рэчы Паспалітай XVIII стагоддзя” [2] і А.Ф. Самусіка “Спецыфіка выкладання "septem artes liberalis" у айчынных брацкіх школах у канцы XVI – першай трэці XVII ст.” [3]. Пытанням з’яўлення і функцыянавання адукацыі на беларускіх землях у кантэксце паўставання айчыннай мысленнай практыкі адведзены і шэраг раздзелаў калектыўнай манаграфіі “Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі”. Што тычыцца канкрэтных гістарычных феноменаў айчыннай адукацыі, такіх, як Іезуіцкія калегіумы, брацкія ці пратэстанцкія школы, піярскія калегіумы, жаночая адукацыя, прыхацкія школы, то яны даволі грунтоўна даследаваны ў рамках гістарычнай і педагагічнай навук, пра што сведчыць шэраг манаграфій айчынных і замежных навукоўцаў.

Адначасова, калі гісторыя беларускай адукацыі даволі змястоўна разгледжана з пункту гледжання складу і ўплыву на агульныя інтэлектуальна-культурныя працэсы, то феномену інтэрнацыяналізацыі старажытнай айчыннай адукацыі, а тым больш яе філасофскім аспектам у цэлым яшчэ мае быць нададзена пачэсная навуковая ўвага. У той час як значэнне інтэрнацыяналізацыйных працэсаў для генезісу і развіцця адукацыі старажытнай Беларусі наўрад ці магчыма аспрэчыць, тым не меньш культурна-філасофскія, калі заўгодна, нават цывілізацыйныя наступствы гэтага працэсу патрабуюць асобнага філасофскага разгляду.

**Візантыйскі генезіс айчыннай адукацыі.** Генезіс гісторыі беларускай адукацыі большасцю навукоўцаў у першую чаргу звязваецца з пранікненнем хрысціянства на тэрыторыі, якія ляжалі паабапал гандлёвага шляху “З варагаў у грэкі”. Калі палітычная гісторыя Старажытнай Русі часта даследуецца з перспектывы высвятлення ролі і месца скандынаўскіх вайсковых дружын у аб’яднанні і стабілізацыі зямель у бассейнах Дзвіны і Дняпра, то інтэлектуальная гісторыя найчасцей пачынае свой адлік з моманту хрышчэння Русі і падлягання яе Канстантынопальскай юрысдыкцыі.

Такі падыход выглядае цалкам апраўданым з пункту гледжання навуковай метадалогіі, таму што сам момант прыходу хрысціянства на тэрыторыю Русі супадае з пачаткам стварэння першых тэкстуальных помнікаў. У гэтым рэчышчы пісьмовая фіксацыя падзей выступае момантам высвячэння гістарычных аб’ектаў з цемры археалагічнай рэчаіснасці.

Сустрэча славянскіх барбараў з вытанчанымі ўзорамі візантыйскай філасофіі запускае механізм змены інтэлектуальнай парадыгмы на землях старажытнай Беларусі. Гэта не толькі адаптацыя монатэізму язычніцкім насельніцтвам, працэс, які спачатку развіваўся ў межах палітычных эліт і з цягам

* Артыкул падрыхтаваны ў рамках фінансавай падтрымкі Лінганьскага педагагічнага ўніверсітэта, Грант № ZB1805 «Даследаванне гісторыі духоўнай культуры Беларусі».

часу ўбіраў усё болей і болей прыхільнікаў сярод розных саслоўяў старажытнага грамадства, але адначасова і пранікненне кніжнай культуры, якую на крылах рэлігіі ўносіла хрысціянства [4].

Візантыйскія місіянеры выконвалі не толькі рэлігійнае пакліканне – распаўсюд хрысціянства сярод язычнікаў, але адначасова спрыялі стабілізацыйным працэсам на барбарскіх тэрыторыях. У гэтым ключы варажская вайсковая сіла ўраўнаважвалася гуманізацыйнымі працэсамі трансляцыі і ўкаранення хрысціянскай рэлігіі ў яе візантыйскай інтэрпрэтацыі. У межах гэтага перыяду можна сказаць, што кроўнае адзінства, на якім раней будаваліся племянныя саюзы, саступала месца хрысціянскай ідэнтыфікацы. Гэты палітычны аспект хрысціянізацыі выявіў неабходнасць з боку старажытных эліт надаваць больш пільную ўвагу адукацыйным працэсам, якія на той час інтэрпрэтаваліся выключна ў рэлігійным рэчышчы.

Ва ўмовах выбудовы новых палітычных супольнасцяў на разнастайных славянскіх землях Візантыя забяспечыла іх поўным наборам неабходных атрыбутаў. Мноства хрысціянскіх прапаведнікаў неслі на беларускія землі не толькі новую рэлігію, але і корпус візантыйскіх ведаў. Менавіта грэчаскія місіянеры Кірыл і Мефодзій у IX ст. н.э. стварылі славянскі алфавіт і пачалі перакладаць хрысціянскі масіў тэкстаў на славянскія дыялекты. На аснове кірыліцы кадыфікуецца царкоўна-славянская мова, якая нараджаецца ў межах функцыянальнай неабходнасці ажыццяўлення літургічных практык. Па сутнасці, хрысціянства прапануе славянам не толькі пісьмо, але і саму мову. У гэтым ключы Візантыя выяўляецца не толькі як адзін з фактараў забеспячэння дзяржаўнасці Старажытнай Русі, але і крыніца пісьмовага голасу, які на пераломе I і II тысячагоддзя н.э. здабылі славянскія плямёны ў яе межах.

З моманту ўзнікнення пісьмовай культуры на Беларускіх землях можна казаць аб пачатку прагісторыі нацыянальнай адукацыі. Разглядаючы гэты працэс нельга не заўважыць два істотныя аспекты. Па-першае, пісьмо, а разам з ім і кніжная культура патрабавала акамуляцыі і тыражавання пісьмовых крыніц, што прадугледжвала інстытуцыянальныя формы працякання гэтага працэсу. З гэтага вынікае, што не само па сабе пранікненне хрысціянскіх місіянераў і грэчаскіх кніг абумовіла з’яўленне нацыянальнай адукацыі, але ўкараненне інстытуцыянальных формаў акамуляцыі і трансляцыі ведаў, гэта значыць манастыроў і прыходаў. Гэтыя ўстановы з аднаго боку збіралі тэкстуальны масіў у сваіх бібліятэках, тыражавалі яго праз перапіс манускрыптаў. Такім чынам ствараліся ўмовы для перадачы рэлігійных ведаў не толькі свецкаму насельніцтву, але і ў межах рэлігійнай іерархіі, забяспечваючы бесперарыўнасць працякання гэтых працэсаў.

Па-другое, місіянерская дзейнасць не заўсёды звязваецца з адукацыяй. Як на прыклад прыход хрысціянства ў саму Грэцыю наўрад ці можна разглядаць у межах адукацыйных працэсаў, але хутчэй ў рэлігійна-палемічным ключы з элементамі палітычнай неабходнасці. У адрозненні ад Рымскай Імперыі Старажытная Русь не мела вытанчанага і адукаванага насельніцтва з развітай адукацыйнай сістэмай. З гэтага вынікае, што культурная і палітычная сінергія патрабавала ад Візантыі не толькі прасоўвання рэлігійных ведаў, але і ведаў як такіх. Базавая падрыхтоўка лакальных кадраў дазваляла метраполіі весці дыялог з больш прадказальнымі палітычнымі партнёрамі, адначасова падпітваючы культурную эвалюцыю славянскіх тэрыторый праз адукацыю таленавітых рэлігійных і палітычных дзеячаў. Такая неабходнасць дыктавала асаблівыя ўмовы выбудовы сістэмы рэлігійных устаноў, якія ў межах рэлігійнай актыўнасці выконвалі, па-сутнасці, функцыі адукацыйных інстытуцый.

Ва ўмовах паступовага пранікнення хрысціянства на прасторы паганскіх плямён Старажытнай Русі неабходнасць укаранення адукацыі абумоўлівалася і з інтэлектуальна-ідэалагічных прычынаў. Натуральнае накладанне хрысціянскай сімволікі на паганскі змест мясцовай культуры прымушаў рэлігійную іерархію пільна ставіцца да праяў сінкрэтызму, асабліва сярод саміх прапаведнікаў. У гэтых умовах мэтай адукацыі робіцца фармаванне чыста хрысціянскага светапогляду, які інтэрпрэтаваўся ў дусе аддзялення рэальнага ад уяўнага. Паганства ў падобнай дыхатаміі інтэрпрэтавалася ў якасці ўяўнага, а значыць хібнага, тады як хрысціянства карэлявала з паняццем рэальнага, а значыць ісціннага. У падобным ключы паганская культура выяўлялася як неразрозненнае мора забабонаў і зман, у той час калі хрысціянства наадварот выдзялала з рэчаіснасці аб’екты, персаніфікуючы іх, а значыць выяўляючы іх у сапраўднай рэчаіснасці. У гэтым ключы барбарскія народы часта інтэрпрэтаваліся ў катэгорыях хтанічнасці, як бязмежныя бясформленныя масы, з якіх хрысціянства крышталізуе ці высвячае ідэнтычнасць, выбудоўваючы дзяржаўныя рамкі працякання ўсвядомленнага сацыяльнага жыцця.

Дэперсаніфікацыя дахрысціянскай Русі бадай з’яўляецца адным з найбольш старых і глыбока ўкаранёных тэзісаў у межах сярэднявечных дэбатаў вакол мясцовай адукацыі. Калі праваслаўны палеміст З. Капустэньскі ў XVII ст. спрачаецца з уніяцка-каталіцкімі апанентамі аб праве каталіцкай царквы існаваць на тэрыторыі рускіх княстваў, ён уводзіць катэгорыі боскага і апостальскага права Канстанцінопальскага патрыярхату, дадзенае праз апостала Андрэя, які па загадзе боскім хрысціў славянскія землі [5, с. 1071]. Па сутнасці, да хросту Русь разглядаецца палемістам у якасці нічыйнай тэрыторыі, пусткамі, якія хрысціянства дадало да цывілізаванага свету. У гэтым кантэксце візантыйскае

хрысціянства афармляе і стварае новую юрысдыкцыю, а з ёй і палітычнага актара, што прадугледжвае на раўне з новай рэлігіяй укараненне поўнага спектру атрыбутаў паўнапраўнай дзяржавы.

Адначасова перыяд хрысціянізацыі Русі прыпаў на эпоху станаўлення Візантыйскай філасофіі (IX–XIV ст.) і новай візантыйскай адукацыі. У межах транзіту Візантыі з агульнарымскага кантэксту ў грэчаскую лакальнасць адбываецца натуральнае перацяканне патрыстыкі ў візантыйскую філасофію, якая засяроджваецца на вымярэнні ісіцны як асноўным напрамку інтэлектуальных штудый [6]. Гэты працэс адбываецца ў рамках адначасовага выкарыстання напрацовак заходняй схаластыкі і ідэалагічна-палітычнай апазіцыі да яе. Не лішне таксама заўважыць даволі трывалую сепарацыю пракыткі ўжывання старажытнагрэчаскай спадчыны візантыйскімі філосафамі, а менавіта выкарыстанне логікі Арыстотыля і метафізікі Платона.

У гэтых умовах патрыярх Фоцій (820–896) – адзін з найбольш таленавітых і адукаваных людзей свайго часу апынуўся як кропкай разрыву паміж Заходняй і Ўсходняй хрысціянскімі цэрквамі, так і сімвалам візантыйскага прарыву ў дачыненнях са славянскімі плямёнамі (лічыцца непасрэдным хрысціцелем Русі і Балгарыі) [6]. У шырэйшым кантэксце гэтыя падзеі даволі моцна ўзаемазвязваюцца, дзе знакамітая Фоцiева схізма (863–867) разглядаецца ў рэчышчы пытання хрысціянізацыі славянскіх земляў (ад Балгарыі да Русі) у абставінах унутрыпалітычнага крызісу ў Візантыі і канкурэнцыі з Заходняй хрысціянскай царквой.

У падобных абставінах не толькі філасофія робіцца інструментальным дапаўненнем тэалогіі, але і адукацыя губляе характарыстыкі ўсеагульнасці, факусуючыся на праблемах прафесійнай падрыхтоўкі святароў і місіянераў. З аднаго боку гэта было істотнай часткай замежнай палітыкі Візантыі, з іншага боку не выпадала спадзявацца на філасофскі ўхіл навукі ва ўмовах нарастаючай асманскай пагрозы і разрабаванне Канстантынопаля крыжакамі (1204 г.). Менавіта пры падзенні Канстантынопаля вышэйшая адукацыя ў сталіцы Візантыі перастае функцыянаваць, зачыняецца знакамітая Школа Філасофіі [7; 32]. Аднаўленне сістэмы вышэйшай адукацыі наступае толькі праз 60 гадоў пры заснаванні Вышэйшай школы Канстантынопаля, хоць не лішне падкрэсліць, што вышэйшыя адукацыйныя інстытуцыі Візантыі не абмяжоўваліся распалажэннем выключна ў сталіцы, што адыграла істотную ролю ў захаванні адукацыйнай традыцыі.

У межах эвалюцыі духоўнай культуры старажытнай Еўропы пад уплывам іудаісцкай традыцыі адбываліся паступовыя змены ў формах і функцыянальных характарыстыках адукацыі. Іудаісцкая культура, на аснове якой паўстала хрысціянства, разглядала адукацыю ў першую чаргу ў межах рэлігійнай актыўнасці. Да нашых дзён іудаісцкая адукацыя канцэнтруецца вакол трансляцыі рэлігійнага вучэння і яго аналізу. У межах Рымскай Імперыі такі падыход наклаўся на моцны філасофска-культурны падмурак папярэдняй інтэлектуальнай традыцыі, у першую чаргу грэчаскай філасофіі. Адначасова мелі ўплыў і больш новыя інтэлектуальныя плыні, такія як гнастыцызм і маніхейства.

Істотнасць свецкай адукацыі для Візантыі можна прасачыць на прыкладзе Патрыяршай школы Канстантынопаля. Гэтая ўстанова вышэйшай адукацыі не гледзячы на глыбокі рэлігійны антураж прадстаўляла цалкам свецкую адукацыю ў якасці прапідэфтыкі да теалагічных штудый [7: 50]. Пры гэтым сама навучальная ўстанова праўдападобна была дэцэнтравана і размяшчалася на базе шэрагу царкоўных і прыхацкіх комплексаў, дзе кожная школа альбо факультэт спецыялізаваўся на асобных задачах – базавае навучанне, граматыка, рыторыка і г.д.

Калі ў Візантыі хрысціянская традыцыя і сістэма адукацыі былі прадстаўлены глыбокім сплавам філасофіі і рэлігійнай дагматыкі, то ў межах Старажытнай Русі хрысціянства прыходзіць як цэласны і закончаны феномен з ярка выражаным іудаісцкім ухілам. Іншымі словамі, адукацыя прыходзіць у выглядзе функцыянальнага дадатку рэлігіі і яе ўтылітарнае значэнне абмяжоўваецца падрыхтоўкай кадраў для рэлігійнай іерархіі. Калі Візантыйская культура адчувала гісторыю паўставання дагматычных нормаў нароўне з эвалюцыяй філасофскага інструментарыя хрысціянскай тэалогіі, то ў мясцовым кантэксце хрысціянства прыйшло як дадзенасць. Тут догмы ўжо не атаясамляліся з дасягнутым кансэнсусам, але функцыянавалі як узоры высокай культуры, ад якіх нельга было адыходзіць ці творча перапрацоўваць у адпаведнасці з мясцовымі звычаямі.

У гэтых абставінах натуральна з’яўляліся фігуры, якія зрабілі моцны ўплыў на станаўленне нацыянальнай адукацыі ў межах асабістага рэлігійнага служэння. Пад такімі фігурамі ў першую чаргу разумеюцца Еўфрасіння Полацкая (1101–1167 н.э.) жаночае манастырскае вучылішча Еўфрасінні Полацкай, і Кірыл Тураўскі (1130–1182 н.э.) манастырская школа Кірылы Тураўскага. Іх дзейнасць – гэта перш за ўсё адкрыццё новых манастыроў і прыходаў, стварэнне багаслоўскіх твораў, перапіс кніг. Пры гэтым перапіс кніг шмат у чым зрабіўся асноўным інструментам адукацыі і сферай яе выкарыстання.

**Філасофска-культурныя асаблівасці інтэрнацыяналізацыйнага генезісу адукацыі старажытнай Беларусі.** Параўноўваючы Візантыю, як традыцыйны ўзор развіцця і функцыянавання адукацыі з прагістарычных часоў да сярэднявечча з больш кароткай гісторыяй лакальнай адукацыі

Старажытнай Русі, варта адзначыць, што ў межах рымска-грэчаскай культуры адукацыя функцыянавала ў рамках свецкіх патрэб, як гэта было і ў іншых магутных цывілізацыях свету. У межах Старажытнай Грэцыі – гэта філасофская адукацыя, якая прапаноўвала функцыянальны рытарычны інструментарый, неабходны ў межах дэмакратычнай арганізацыі грэчаскіх полісаў. У Кітаі адукацыя развівалася ў межах падрыхтоўкі чынавецкіх кадраў, а дзяржаўныя іспыты станавіліся істотным момантам у жыцці кожнай асобы, якая звязвала сваю прафесійную дзейнасць з дзяржаўнай службай. Тое ж адбывалася ў старажытным Егіпце, дзе адукацыя адыгрывала ўтылітарную ролю падтрымання працы дзяржавы і чынавецкага апарату, сімвалам такой адукацыі з'яўляліся школы пісцоў. У гэтым жа ключы развівалася рымская адукацыя, якая кіравалася неабходнасцю падтрымання разгалінаванага дзяржаўнага апарату, які яднаў шырокія тэрыторыі, раскінутыя на розных кантынентах.

У рамках функцыянавання старажытнарускіх княстваў не выпадае казаць аб неабходнасці адукацыі ў пабудове кар'еры, не звязанай з рэлігійнай іерархіяй. У зачаткавым выглядзе дзяржаўнага апарату як князь так і яго дружына існавалі ў фармаце вайсковага ўдасканалення і фізічнай сілы. Парадак збора даніны і вядзенне перамоваў з замежнымі партнёрамі, як і абмежаванасць дзяржаўнага апарату ў раздробленых феадальных княствах па сутнасці не патрабавалі глыбокіх ведаў, якія прадстаўляла вышэйшая адукацыя. Адначасова, такая адукацыя давала магчымасць пабудовы рэлігійнай кар'еры, што з'яўлялася прывабным прафісійным выбарам на працягу сотняў гадоў развіцця не толькі рускіх, але і іншых еўрапейскіх дзяржаў.

У гэтым сэнсе выбар Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага можа разглядацца як перш за ўсё прафесійны выбар кар'ерных магчымасцяў, якія прадстаўляла тагачасная адукацыя. Першая выбрала шлях рэалізацыі свайго інтэлектуальнага патэнцыялу ў межах культурна-цывілізацыйных ператварэнняў у Полацкім княстве, што безумоўна выглядала больш прывабна, чым абмежаваны палітычны ўплыў у ролі жонкі князя ў запламбаванай прасторы полацкай перыферыі. Другі выбраў клірыкальную кар'еру як альтэрнатыву бізнесу і ў гэтым сэнсе адукацыя прапаноўвала не толькі магчымасці рэалізацыі асабістых амбіцый, але і несувымерна большыя рэсурсы, якія па сваім значэнні адпавядалі магчымасцям палітычнай улады.

Дагматычны характар фармату адукацыі і засяроджанасць на традыцыі для Візантыі і Заходняй Еўропы пераламу тысячагоддзяў было не чым іншым, як пэўным перыядам развіцця інтэлектуальнай культуры, калі заўгодна, спецыфічным стылем арганізацыі мысленнай актыўнасці (каментатарства). У той час як для нацыянальнага кантэксту Старажытнай Русі гэта быў асноўны і першапачатковы ўзор арганізацыі сістэмы падрыхтоўкі рэлігійнай іерархіі, істотнасць якога палягала як на кволасці мясцовай інтэлектуальнай традыцыі, так і сінкрэтычных праявах, якія натуральным чынам узнікалі пры спробах інтэрпрэтацыі імпартыраваных канцэптаў у сістэме мясцовых каардынат.

Сведчанне гэтым праявам можна знайсці ў творчасці Кірылы Тураўскага для якога не ўсялякі чалавек мае здольнасць да пазнання, між тым як наадварот, большасць пазбаўлена яе. Тыя, хто валодае гэтай здольнасцю – маюць ласку Божую, якая заключаецца ў магчымасці бачыць рэчы такімі, якія яны ёсць у адпаведнасці з Боскай задумай. Адначасова людзі, якія не атрымалі боскае прасвятленне таксама могуць мець пазнавальную здольнасць, якая можа быць сфармавана ў выніку навучання ў межах устойлівай інтэлектуальнай традыцыі. У гэтым кантэксце нават асобы, якія не маюць адпаведнага таленту, могуць навучацца і выкладаць у адпаведнасці з атрыманымі ведамі. Аднак у выпадку, калі падобныя людзі пачынаюць разважаць у суцэльным адрыве ад традыцыі, – з'яўляюцца ерасі, якімі гэтыя людзі заражаюць іншых [8].

У межах падобнай інтэрпрэтацыі фармавалася ўстойлівая сувязь паміж пазнавальнай функцыяй чалавека і яго рэлігійнай верай. Адпачатку выкрышталізавана ў межах візантыйскай філасофіі як інтэнцыя да спасціжэння аб'ектыўнай рэчаіснасці, праз якую бог можа размаўляць з чалавекам, цягам далейшага развіцця ўвага да натуральнай рэчаіснасці была рэдукавана як лішкавы пасярэднік. Эвалюцыя візантыйскай філасофіі ў бок ісіхазма Грыгорыя Паламы (1296–1359) з'яўлялася натуральным развіццём тагачаснай думкі ў абставінах змяншэння тэрыторый дзяржавы і згубай кантролю над былымі калоніямі. Калі ў эпоху Кірылы Тураўскага і Клімента Смаляціча (памёр каля 1164 г.) тыповым быў пошук босскай ласкі праз карэляцыю паміж біблейскімі тэкстамі і аб'ектыўнай рэчаіснасцю, то ўжо ў творчасці Грыгорыя Цамблака (1364–1419/1420) асоба функцыянавала ў трансцэндзентных ландшафтах ісіхазма, іншымі словамі, выходзіла на прамую сувязь з богам [9].

**Заходні вектар інтэрнацыяналізацыі.** З падзеннем ролі Візантыі яе інтэлектуальнае і палітычнае першынство пакідае Старажытную Русь не толькі ў форме феадальнай раздробленасці, але і ў форме паўставання лакальных палітычных цэнтраў. Змяненне геапалітычнай сітуацыі, а таксама пазнейшыя поспехі ў вайне з манглольскімі і тэўтонскімі заваёўнікамі, якія суправаджаліся аб'ядпаннем тэрыторый ў межах Вялікага Княства Літоўскага і Польскага Каралеўства, ускладненне дзяржаўнага апарату, самастойная знешняя палітыка – усё гэта дыктавала неабходнасць фармавання больш разгалінаванай сістэмы адукацыі. Па сутнасці, з'яўленне Кракаўскай акадэміі (1364 г.) было сведчаннем палітычнага

пераходу ад стану феадальнай раздробленнасці да стварэння ўсходнееўрапейскіх федэратыўных дзяржаў. Адначасова змяняецца і вектар інтэрнацыяналізацыі адукацыі. Цяпер мясцовыя эліты накіроўваюцца ў Кракаўскую акадэмію, пасля якой працягваюць навучанне ў адукацыйных цэнтрах Італіі, Германіі ці Францыі. Гэты працэс актыўна развіваецца цягам XV–XVI ст., дасягнуўшы апагею на пераломе XVI–XVII ст., калі тэрыторыя Вялікага Княства Літоўскага пакрываецца сеткай Іезуіцкіх калегіумаў.

Кракаўская акадэмія была адкрыта як studium generale, то бок прымала на свае праграмы студэнтаў як польскіх, так і замежных [10]. Стараннямі Караля Ягайлы Кракаўская акадэмія прымае асобную квоту для навучання выхадцаў з Вялікага Княства Літоўскага, а таксама будуе бурсу адмыслова для іх пражывання. Аснову адукацыі складалі вольныя мастацтвы – набор дысцыплін, сфармаваны ў час позняй Рымскай Імперыі. Адукацыйны комплекс складаўся з двух цыклаў – Trivium и Quadrivium, дзе першы прадугледжваў атрыманне базавых ведаў па логіцы, рыторыцы і лацінскай мове, у той час калі другі цыкл засяроджваўся на больш прасунутым вывучэнні філасофіі, геаметрыі, арыфметыкі, астраноміі і музыкі [11]. Пры гэтым акадэмія працавала па італьянскай мадэлі Балонскага ўніверсітэту, што прадугледжвала абмежаваны ўплыў царквы на дзейнасць навучальнай установы.

З праявдзеннем больш актыўнай знешняй палітыкі, павялічэннем дзяржаўнага апарату Польшча, а з тым і Вялікае Княства Літоўскае патрабавалі большую колькасць не толькі адукаваных рэлігійных іерархаў, але і дзяржаўных чыноўнікаў. Істотнасць тагачаснай адукацыі для жыццядзейнасці дзяржавы добра перадае абставіны і дух стварэння Кёнігсбергскага ўніверсітэту ў 1544 г., які паўстаў у межах пераходу тэакратыі Тэўтонскага ордэну да свецкай дзяржавы Прускага герцагства [12]. Пры гэтым вартасць адукацыі для пабудовы клірыкальнай кар'еры не страчвала сваю актуальнасць, па сутнасці ўсе царкоўныя іерархі з кожнай хрысціянскай канфесіі як правіла атрымлівалі адукацыю за мяжой: Іпацій Поцей, Сымон Будны, Мілецій Сматрыцкі і шматлікія іншыя.

Узаемазалежнасць паміж развіццём адукацыі і дабрабытам дзяржавы на пераломе XVI і XVII ст. робіцца канвенцыянальным поглядам на тэрыторыях сярэднявечнай Беларусі. Інтэрпрэтуючы разарванне царкоўнай еднасці заходняга і ўсходняга хрысціянства, уніяцкі палеміст Л. Крэўза (памёр у 1639 г.) пералічваў тры найбольш жахлівыя страты, якія скіраваў бог на грэкаў: страта незалежнасці, разрабаванне культурных багаццяў і закрыццё ўніверсітэтаў. Дэградацыя інтэлектуальнага развіцця і страта вядучых пазіцый у адукацыі і філасофіі інтэрпрэтаваліся Л.Крэўзам як боскае пакаранне за схізму, пры гэтым дэградацыя адукацыі прымалася як крыніца, а не следства дзяржаўнага бязладдзя: «Калі святло пацямнела, якая ж будзе цемра? На што спадзявацца свецкім, да якіх святло праз духоўных прыходзіць, калі тыя духоўныя ў цемры? Што гэта, калі не пакаранне Божа?» [13, с. 216].

Адначасова разрабаванне Канстантынопалю крыжакамі інтэрпрытавалася каталіцкімі і ўніяцкімі палемістамі як акт змены інтэлектуальнага першынства з усходу на захад. Далейшае згасанне Візантыйскай Імперыі – гэта таксама працэс пераходу ўніверсітэцкіх выкладчыкаў, навукоўцаў, чыноўнікаў з усходу на захад. У гэтым ключы ўніцятва, як змена юрысдыкцыі праваслаўнай царквы Вялікага Княства Літоўскага з Кантсантынопалю на Рым разумелася як натуральны пераход да перадавой мудрасці. Лацінская адукацыя, як найбольш актуальная на той час, павінна была забяспечыць якасны культурны скачок праваслаўнай супольнасці. Л.Крэўза падкрэсліваў: «Колькі дабра спадзяемся мы атрымаць у кароткім часе, калі будзем вывучаць навукі, як продкі нашы ў краях рускіх пэўна былі людзьмі вучонымі» [13, с. 287].

У занядбанні адукацыі бачылі небяспеку і праваслаўныя. Князь К. Астрожскі, крытыкуючы праваслаўнае навучанне і супрацьпастаўляючы яго пратэстанцкаму, пісаў І. Поцею: «А ад чаго іншага развялося столькі ляніўства, апальства і адступніцтва ад веры, як найбольш ад таго, што занядбаны настаўнікі, і стаміліся вучыць, стаміліся прапаведаваць слова Боскае, занядбаны навукі, занядбаны казанні» [14, с. 64–65]. Адначасова беларускія магнаты адмыслова спансавалі моладзь для атрымання адукацыі за мяжой, каб па вяртанні падрыхтаваныя кадры стваралі новую пратэстанцкую іерархію. Тут адукацыя таксама прадстаўляла сабой натуральны сацыяльны ліфт, які функцыянаваў праз інтэрнацыянальныя каналы.

Студэнты, якія атрымалі адуказыю за мяжой рабіліся рухаючай сілай развіцця беларускай культуры і палітычнай сістэмы. Паказальным з'яўляецца, што за два стагоддзі ва ўніверсітэтах заходняй Еўропы агулам вышэйшую адукацыю атрымалі больш за 700 выхадцаў з Беларусі, гэта не толькі Кракаў, але і Прага, Берлін, Лейпцыг, Вітэнберг, Нюрнберг, Кёнігсберг, Балонья, Базаль, Парыж і нават Эдынбург [1, с. 358]. І калі ў першай палове ІІ тысячагоддзя н.э. інтэрнацыяналізацыя айчыннай адукацыі базавалася на засваенні позняй патрыстыкі ў выглядзе Візантыйскай філасофіі, то асноўны вектар інтэрнацыяналізацыі адукацыі сярэдзіны тысячагоддзя ўпэўнена фундаваўся на заходнееўрапейскай схаластыцы.

Варта адцеміць, што большасць культурных феноменаў сярэдзіны тысячагоддзя на тэрыторыі Беларусі з вялікай ступенню альбо з'ўляліся вытворнымі ад схаластычнай філасофіі, альбо наўпрост на ёй фундаваліся. Знакаміты сюжэт інтэлектуальнага жыцця сярэднявечнай Беларусі – рэлігійная палеміка,

якая разгортвалася амаль стагоддзе паміж іерархамі розных хрысціянскіх канфесій з канца XVI па сярэдзіну XVII ст., па сваім фармаце і складзе ўдзельнікаў з'яўляўся не чым іншым, як працягам схаластычных практыкумаў на радзіме сярод выпускнікоў замежных універсітэтаў. У сваю чаргу такія штудыі адкрылі магчымасці да непасрэднага імпарту заходнееўрапейскай адукацыі, які выявіўся ў рэфармацыйных працэсах арганізацыі пратэстанцкіх школ і контррэфармацыйных – стварэння сеткі іезуіцкіх калегіумаў.

**Рэфармацыя і контррэфармацыя ў працэсах інтэрнацыяналізацыі айчыннай адукацыі.** У гэтым ключы паказальны ўплыў пратэстантызму і пратэстанцкай адукацыі на агульнае інтэлектуальнае поле тагачаснай Беларусі. Вяртанне на радзіму студэнтаў з Кёнігсбергскага ўніверсітэту, а таксама адукацыйных устаноў Германіі і Швейцарыі выклікала бурнае развіццё Рэфармацыі на беларускіх землях у XVI ст. Былі заснаваныя шматлікія пратэстанцкія школы, найбольш знакамітыя з іх функцыянавалі ў Вільні, Навагрудку, Брэсце, Ракаве, Мінску, Слуцку і Іўе [15]. Асаблівасцю гэтых школ з'яўлялася безумоўная спецыялізацыя на лінгвістычнай праблематыцы, пры гэтым адметна, што нацыянальным мовам адводзілася асаблівае значэнне.

У гэтым сэнсе варта падкрэсліць, што шмат у чым павелічэнне значэння нацыянальных моў (польскай і старабеларускай) на тэрыторыях Польскага Каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага, стварэнне першых граматык не ў апошнюю чаргу звязана з працэсамі інтэрнацыяналізацыі адукацыі. З некаторай упэўненасцю можна сцвярджаць, што менавіта дзякуючы пратэстантызму, яго ўвазе да нацыянальных моў прадстаўнікі іншых традыцыйных канфесій звярнулі ўвагу да гэтай праблематыцы. У 1568 г. у Кракаўскай Акадэміі публікуецца першая граматыка польскай мовы «Polonicae grammatices institutio», у 1594 г. выходзіць больш прасунуты варыянт «Compendium liguare polonicae», а ў 1619 г. пабачыла свет першая граматыка старабеларускай мовы "Грамматіки славенскія правилноє синтаґма". Пры тым, што калі першыя граматыкі польскай мовы былі створаны натуралізаванымі замежнымі навукоўцамі, то старабеларуская граматыка ўжо была складзена мясцовым выпускніком шэрагу замежных універсітэтаў М.Сматрыцкім.

У пэўным сэнсе прыход іезуітаў у Беларусь у 1570 г., а таксама стварэнне разгалінаванай сеткі брацкіх праваслаўных школ – з'яўлялася этапам агульнаеўрапейскай рэакцыі на рэфармацыйныя рухі з боку каталіцкай царквы. З адкрыццём Віленскай акадэміі ў 1578 г. цікаўнасць да лакальнай вышэйшай адукацыі ўзрастае яшчэ больш. Навучанне ў іезуіцкіх калегіумах рэалізоўвалася на бязвыплатнай аснове, пры гэтым шэраг абітурыентаў не абмяжоўваўся саслоўнымі і канфесійнымі рамкамі. У гэтых умовах адукацыя зрабілася даступным інструментам пабудовы клірыкальнай кар'еры – рэальнай магчымасці выкарыстаць сацыяльны ліфт у саслоўным грамадстве, дзе, як правіла, жыццё рэгламентавалася сацыяльным статусам, дадзеным пры нараджэнні.

Пасля адкрыцця Віленскай акадэміі іезуіты пачалі актыўна развіваць сетку калегіўмаў па ўсёй Беларусі. Найбольш старэйшымі навучальнымі установамі гэтага кшталту з'яўляліся Полацкі (1580 г.) і Нясвіжскі (1586 г.) калегіумы, далейшае пашырэнне сеткі ўключала Оршу (1616 г.), Брэст (1623 г.), Гродна (1625 г.), Пінск (1638 г.), Навагрудак (1645 г.). Адразу пасля адкрыцця такія ўстановы карысталіся вялікай папулярнасцю, у адной Вільні за 40 год актыўнасці колькасць студэнтаў узрасла са 160 да 1210 чалавек, а ў Полацку за той жа перыяд са 100 чалавек да 1647 [15]. З цягам часу да Іезуіцкіх калегіумаў далучыліся шматлікія іншыя сярэднія навучальныя ўстановы: піяраў, базыльянаў і інш, якія таксама мелі замежныя карані і карысталіся замежнымі ўзорамі навучальных праграм і падыходаў да выхавання.

Па сутнасці, апісаны працэс з'яўляўся другой хваляй інтэрнацыяналізацыі беларускай адукацыі, якая насунулася на Беларусь ужо не з поўдня, а з захаду. У гэтых умовах адбываецца адраджэнне і лакальнай традыцыі праваслаўнай адукацыі ў фармаце брацкіх школаў, якія ўзніклі як альтэрнатыва пратэстанцкім і каталіцкім навучальным установам. Спачатку з'явіліся школы ў Вільні (1584 г.) і Львове (1585 г.), і хоць надалей найбольшая колькасць такіх устаноў функцыянавала ва Украіне (30 школ), аднак і беларускія землі актыўна ўключыліся ў гэты працэс: такія школы былі адчынены ў Брэсце (1591 г.) і Мінску (1592 г.), а на пачатку XVII ст. з'явіліся ў Полацку, Оршы і Шклове [3].

Брацкія школы ўвабралі ў сябе як асаблівасці пратэстанцкіх навучальных устаноў, так і каталіцкіх калегіумаў. У аснове адукацыі ляжала ўся тая ж праграма Trivium и Quadrivium з большым упорам на мовазнаўства. Тут вывучалася лаціна, грэцкая і царкоўна-славянская мовы, пры гэтым выключна новае гучанне здабылі нацыянальныя мовы – польская і старабеларуская. З аднаго боку вывучэнне замежных моў дазваляла далучыцца студэнтам да еўрапейскай навукі, паехаць па навучанне за мяжу, ці зрабіць кар'еру ў межах гандлёвых зносін з замежнымі краінамі, з іншага боку нацыянальныя мовы сталі часткай пабудовы новай ідэалагічнай тоеснасці ўнутры тагачасных дзяржаў. Апагеем развіцця праваслаўнай адукацыі стала адкрыццё Кіева-Магілянскай акадэміі ў 1632 г. – вышэйшай навучальнай установы Украіны і Беларусі.

**Палеміка аб вектарах і выніках інтэрнацыяналізацыі адукацыі.** Ва ўмовах замены візантыйскага падыходу да арганізацыі ведаў на схаластычны ўзнікае і сімптаматычная палеміка аб выніках і вектарах інтэрнацыяналізацыі нацыянальнай адукацыі. Як бы ні падавалася на першы погляд, што гэта выключна надзённая праблематыка ўкаранення балонскай сістэмы, варта падкрэсліць, што падобныя настроі натуральна ўзнікалі пры змене адукацыйнай парадыгмы і ў больш аддаленыя гістарычныя перыяды. Абгрунтоўваючы неабходнасць пераходу праваслаўнай іерархіі пад юрысдыкцыю Папы Рымскага каталіцкія і ўніяцкія палемісты падкрэслівалі неабходнасць мадэрнізацыіі айчыннай адукацыі. Далучэнне да сучасных універсітэцкіх сетак і апошніх дасягненняў тагачаснай навукі і філасофіі прызнавалася за асноўныя шляхі выхаду з арганізацыйнага крызісу праваслаўнай царквы і адным з вектараў росту інтэлектуальнага і матэрыяльнага дабрабыту Вялікага Княства Літоўскага.

У сваю чаргу, частка праваслаўнай іерархіі якая апынулася ў апазіцыі да ўніі, звяртала ўвагу, што пры пераходзе да каталіцкай адукацыі губляецца аўтэнтычны рэлігійна-філасофскі антураж і першапачатковы ідэалагічны фармат візантыйскага ўзору хрысціянства. Пры тым, што само хрысціянства яшчэ некалькі стагоддзяў таму з'яўлялася выключна імпартаваным феноменам, якое змагалася за сваё існаванне з праявамі сінкрэтызму, ужо на прыканцы XVI ст. паважалася за крыніцу нацыянальнай ідэнтычнасці і парадыгму агульнаеўрапейскай філасофскай і рэлігійнай мудрасці. З гэтай нагоды праваслаўны паleміст З. Капустэнькі заўважаў: «Вялікая кара Божая на краіны заходнія, пасля адарвання касцёла Лацінскага ад царквы ўсходняй наступіла, бо адышоўшы ад крыніцы веры, адышлі і ад правай мудрасці, адкінулі правыя дагматы, а ўзяліся за гэтага свету прыкладныя навукі; ад чаго ў ерасі розныя ўпалі, і самі паміж сабою да вялікай нязгоды прыйшлі і адзін з іншым у пісьмах адзін аднаму супрацьстаяць» [5, с. 898]. Тут палемістам ставіцца пад сумнеў не вартасць адукацыі, але пралікі каталіцкай царквы ў яе выхаваўчым аспекце. Пры гэтым падркэсліваецца, што лацінская мудрасць другасная: «А што рымляне хваляцца навукаю гэтага свету – «чужым пер'ем хваляцца», «у чужым плашчы выхваляюцца»! Грэцкія гэта мудрасці – Платонава і Арыстотылева і іншых філасафаў Грэцкіх мудрасць, часткова ім адасобленая!» [5, с. 900]. У гэтым ключы дыхатамія: перадавое (прагрэсіўнае) і спрадвечнае (праверанае) з'яўляецца даўнім сюжэтам не толькі гісторыі інтэрнацыяналізацыі айчыннай адукацыі, але і натуральным спадарожнікам мадэрнізацыйных працэсаў.

**Вынікі.** Падводзячы вынікі можна заключыць, што шмат у чым генезіс беларускай адукацыі – гэта гісторыя, заснаваная на даўгатэрміновых міжнародных сувязях. Адначасова гэта тандэм двух паралельных і ўзаемазвязаных сюжэтных ліній – паўставання моцнай і разгалінаванай палітычнай улады і развіцця рэлігійнай адукацыі.

Адукацыя прыходзіць у Беларусь з Візантыі як цэласны і, у першую чаргу, рэлігійны феномен. Адначасова яна прыходзіць як кар'ерная магчымасць у новай сферы жыцця тагачаснага грамадства – царкоўнай арганізацыі. Клірыкальная кар'ера на доўгія стагоддзі робіцца выдатнай альтэрнатывай вайсковай службе, пры гэтым такой магчымасцю маглі скарыстацца не толькі шляхецкія саслоўі, але і прадстаўнікі іншых сацыяльных класаў.

Другая хваля інтэрнацыяналізацыі адукацыі звязвалася з заходнім уплывам каталіцкай і пратэстанцкай канфесій, а таксама адукацыйнай мабільнасцю ў напрамку заходніх дзяржаваў. Усё гэта стала магчымым пад час узбуйнення дзяржаўнага апарату і выбудовы незалежнай знешняй палітыкі. Пры гэтым развіццё праваслаўнай адукацыі адбывалася ў рэлевантым фармаце, як адаптацыя заходніх падыходаў у рамках стратэгічнай канфесійнай канкурэнцыі.

Як першая, так і другая хваля інтэрнацыяналізацыі адуцкацыі развіваліся ў межах рэлігіі і насілі ярка выражаны рэлігійны характар. У гэтым ключы Беларусь, як правіла, засвойвала вынікі замежных інтэлектуальных працэсаў.

У якасці асноўнага выніку варта дапусціць, што прагісторыя беларускай адукацыі была ініцыявана і адначасова развівалася як сюжэт імпарту традыцыі і кадраў. Інтэрнацыяналізацыя адукацыі з'яўлялася не толькі крыніцай, але і энергетычным цэнтрам, які падпітваў яе жыццядзейнасць і развіццё. Дэбаты, якія суправаджалі старажытную гісторыю развіцця нацыянальнай адукацыі, яскрава сведчаць, што цэнтральны момант несупадзення поглядаў палягаў не на ацэнках неабходнасці інтэрнацыяналізацыі адукацыі, але на выбары яе вектараў. У канчатковым рахунку інтэрнацыяналізацыя адукацыі канвенцыянальна разумелася істотным механізмам падтрымання яе якасці, а таксама крыніцай інтэлектуальнага і матэрыяльнага дабрабыту як асобнага індывіда, так і грамадства ў цэлым.

ЛІТАРАТУРА


1. Яноўскі, А.А. Універсітэт Беларусі: асэнсаванне і рэалізацыя яго ідэі ў гісторыка-палітычных рэаліях часу / А.А. Яноўскі, А.Ф. Самусік // Российские и славянские исследования : науч. сб. Вып. 7 / редкол.: А.П. Сальков, О.А. Яновский (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2012. – С. 357–370.
2. Тарасюк, Я.В. Рэформа адукацыі ў Рэчы Паспалітай XVIII стагоддзя / Я.В. Тарасюк // Вестник Полоц. Гос. ун-та. Сер. Е, Педагогические науки. – 2012. – № 7. – С. 154–157.

3. Самусік, А.Ф. Спецыфіка выкладання "septem artes liberalis" у айчынных брацкіх школах у канцы XVI – першай трэці XVII ст. / А.Ф. Самусік // Вышэйшая школа. – 2016. – № 2. – С. 57–60.
4. Русь і Візантыйска-Балгарская тэалагічная і філасофская традыцыя: праблема вучнёўства / В.Б. Евароўскі [і інш.] // Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. У 6 т. / Нац. акад. навук Беларусі ; Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – Т. 1. Эпоха Сярэднявечча. – С. 243–256.
5. Капустэньскій, З. Палінодія / З. Капустэньскій // Русская Историческая Библиотека. – СПб., 1878. – Т. 4. – С. 313–1200.
6. Katelis Viglas. A Historical Outline of Byzantine Philosophy and Its Basic Subjects. University of Thessaloniki. – Mode of access: https://philpapers.org/archive/VIGAHO.pdf.
7. Constantinides, C.N. Hgher Education in Byzantium in the Thirteenth and Early Fourteenth Centuries (1204–1310) / C.N. Constantinides ; Cyprus research Centre. – Nicosia, 1982. – 222 p.
8. Філасофскія падставы творчасці Кірылы Тураўскага // В.Б. Евароўскі [і інш.] // Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. У 6 т. / Нац. акад. навук Беларусі ; Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – Т. 1. Эпоха Сярэднявечча. – С. 347–361.
9. Казакова, Т.П. Творчасць Грыгорыя Цамблака ў Вялікім княсве Літоўскім і традыцыі ўсходнеславянскага красамоўства / Т.П. Казакова // Российские и славянские исследования.– 2009. – Вып. 4. – С. 258–265.
10. Pedersen, O. The First Universities. Studium generale and the origins of university education in Europe / O. Pedersen. – Cambridge : Cambridge University Press, 2000. – P. 133.
11. Derwich, M. Uwagi nad genezą i miejscem edukacji obywatelskiej w polskim szkolnictwie średniowiecznym / M. Derwich // Historyczne konteksty edukacji obywatelskiej w społeczeństwie wielokulturowym. – Kraków : Impuls, 2007.
12. Лавринович, К.К. Альбертина: Очерки истории Кенигсбергского университета / К.К. Лавринович. – Калининград : Калинингр. книж. изд-во, 1995. – 416 с.
13. Кревза, Л. Оборона унии. Сочинение Виленского архимандрита Льва Кревзы 1617 г. / Л. Кревза // Русская Историческая Библиотека. – СПб., 1878. – Т. 4. – С. 157–312.
14. Острожски, К. Послание И. Потею / К. Острожски // Акты Западной России. – СПб., 1851. – Т. 4. – С. 63–66.
15. Косман, М. Рэфармацыйная і контррэфармацыйная школьная адукацыя на беларускіх землях Вялікага Княства Літоўскага / Косман Марцэлі // З гісторыі культуры Вялікага Княства Літоўскага. – Мінск, 2010. – С. 226–251.

*Пастуміў 28.03.2019*

## PHILOSOPHICAL ASPECTS OF EDUCATIONAL INTERNATIONALIZATION OF X–XVIII cent. ANCIENT BELARUS

***D. SMALIAKOU***

*The article deals with philosophical aspects of educational internationalization of ancient Belarus between X–XVIII cent. From the early start of Ancient Rus' and finishing the higher point of Jesuit Education the educational internationalization was one of the key elements of genesis as well as maintaining of development of ancient Belarusian education. The same processes were explored as the changing of Byzantium philosophy influence to scholastic philosophy of Western Europe. As the result, the education played important role in the creation of Christian hierarchy and Christian religion activity in ancient Belarus, as well as the importance of this process to build the alternative career for individuals as the alternation to military crevice.*

***Keywords:*** *Belarusian educational internationalization, Byzantium philosophy, Scholastics, the history of Belarusian education.*